УДК 069.8+069.68

***В. В. Навіцкая,***
*намеснік дырэктара па навуковай і асветніцкай рабоце*
*музея «Замкавы комплекс «Мір»,*
*саіскальнік вучонай ступені кандыдата культуралогіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# НАВУКОВА-ЭКСПАЗІЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У МУЗЕЯХ БЕЛАРУСІ ГІСТАРЫЧНАГА ПРОФІЛЮ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

**Анатацыя**. У артыкуле засяроджана ўвага на навукова-экспазіцыйнай дзейнасці вядучых дзяржаўных музеяў гістарычнага профілю, такіх як Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой». Цікавасць з боку наведвальнікаў падштурхнула да змен у экспазіцыях музеяў у апошнія два дзесяцігоддзі.

**Ключавыя словы**: музей; экспазіцыя; гістарычны профіль; музеязнаўства.

***O. Novitskaya,***
*Deputy Director for Scientific and Educational Work of the Mir Castle Complex Museum, Candidate of the degree of Candidate of Art History of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts"*

# SCIENTIFIC AND EXHIBITION ACTIVITIES IN HISTORICAL MUSEUMS OF BELARUS AT THE PRESENT STAGE

**Abstract**. The article focuses on the scientific and exposition activities of the leading state historical museums, such as the National Historical Museum of the Republic of Belarus, the Belarusian State Museum of the Great Patriotic War and the Memorial Complex "Brest Hero Fortress". The interest on the part of visitors prompted changes in the expositions of these museums over the past two decades.

**Keywords**: museum, exposition, historical profile, museum studies.

Адным з кірункаў дзейнасці ў музеі з'яўляецца экспазіцыйная работа, без якой музей ператвараецца ў архіў дакументаў, у склад незапатрабаваных рэчаў.

Трактоўка паняцця музейнай экспазіцыі ў сучасным музеязнаўстве вар'іруецца ў залежнасці ад тэарэтычнай пазіцыі даследчыка. Яна падаецца, па-першае, як складанаарганізаваная

сістэма, якая валодае ўласнай унутранай структурай, па-другое, як форма прэзентацыі музеем спадчыны, па-трэцяе, як мэтанакіраваная і навукова-абгрунтаваная сукупнасць музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў, па-чацвёртае, як асаблівы сінтэтычны навукова-мастацкі твор, па-пятае, як тэкст. Наконт апошняга вызначэння расійскі даследчык М. А. Нікішын заўважае, што экспазіцыя складаецца з мноства музейных прадметаў (знакаў і сімвалаў), экспазіцыя – гэта і ёсць той тэкст, які павінен «прачытаць» наведвальнік [9, с. 27].

Музейная экспазіцыя ўключае як мінімум тры віды твораў: навуковую канцэпцыю, увасобленую ў тэматыка-экспазіцыйных планах; сцэнарнае рашэнне; дызайнерскае, ці мастацкае рашэнне [2, с. 141].

Паняцце «навуковая канцэпцыя экспазіцыі» адсутнічала ў савецкай музеязнаўчай навуцы і практыцы да 1970-х гг. Асноўная ўвага надавалася арганізацыі тэматычнай структуры і раскрыццю пэўных тэм. Паступова прыйшло паразуменне, што для стварэння лагічна пабудаванай сукупнасці музейных прадметаў у пэўнай прасторы, якая выконвае інфармацыйную, камунікатыўную, выхаваўчую, эстэтычную і іншыя функцыі, павінна быць распрацавана навуковая канцэпцыя [1, с. 558].

Музейная сетка Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе дастаткова дынамічна развіваецца, штогод папаўняючыся музейнымі ўстановамі розных тыпаў і профіляў. Абагульненыя даныя збіраюцца і сістэматызуюцца ў рэестры музейных устаноў краіны. Найбольш вывучаная частка музейнай сеткі краіны, падпарадкаваная Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь.

Усю сукупнасць музеяў Беларусі можна сістэматызаваць і класіфікаваць па розных крытэрыях. Адным з шырока распаўсюджаных з’яўляецца крытэрый профільнасці.

У Дзяржаўным рэестры музеяў Рэспублікі Беларусь на 13 студзеня 2022 г. у краіне налічваюцца 159 музеяў, у тым ліку 39 – гістарычнага і ваенна-гістарычнага профіляў [10]. Асноўны акцэнт у даследаванні зроблены на навукова-экспазіцыйную дзейнасць вядучых дзяржаўных музеяў гістарычнага профілю, такіх як Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой». Менавіта цікавасць з боку наведвальнікаў падштурх-

нула да змен у экспазіцыях гэтых музеяў у апошнія два дзесяцігоддзі.

Праца над экспазіцыяй Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь вялася ў мэтах выканання пратакола даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі ад 30 снежня 2007 г. № 37. Навуковая канцэпцыя экспазіцыі была падрыхтавана вядучымі супрацоўнікамі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь сумесна з навукоўцамі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Абмежаваныя плошчы пад пастаянную экспазіцыю не дазволілі шырока прадставіць гісторыю краіны. У выніку абноўленая экспазіцыя была падзелена на наступныя перыяды: «Першабытны строй на тэрыторыі Беларусі», «Беларусь у Сярэдневякоўі», «Беларусь другой паловы XIII – першай паловы XVI ст.», «Беларусь другой паловы XVI–XVIII ст.», «Беларусь у канцы XVIII – пачатку XX ст.», «Беларусь у 1917–1939 гг.», «Беларусь у 1939–1991 гг.». Такім чынам, храналагічныя рамкі экспазіцыі ахапілі перыяд ад часу паяўлення чалавека на тэрыторыі Беларусі (100 тыс. гадоў да н. э.) да 1991 г. – часу атрымання краінай дзяржаўнай незалежнасці. Перыяду Рэспублікі Беларусь (з 1991 г.) прысвечана экспазіцыя філіяла Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь «Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці» [11].

У 2017–2018 гг. пачалася работа па дапрацоўцы канцэпцыі экспазіцыі і тэматыка-экспазіцыйных планаў, складанню тэматычнай структуры. Пытанне па значных зменах паўстала ў сувязі з прыняццем рашэння аб узвядзенні новага будынка музея па праспекце Пераможцаў у г. Мінск. Была створана рабочая група на чале з намеснікам дырэктара гістарычнага музея Н. У. Калымагай, у склад якой увайшлі навукоўцы Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Архітэктурна-мастацкае рашэнне было падрыхтавана мастацкім унітарным прадпрыемствам «Мастацкі камбінат» Беларускага саюза мастакоў пры ўдзеле супрацоўнікаў музея.

Распрацоўцы новай канцэпцыі музея папярэднічаў шэраг буйнамаштабных экспазіцыйных праектаў, якія можна разглядаць у якасці пляцоўкі па актуалізацыі метадаў і прыёмаў інтэрпрэтацыі музейных прадметаў і стварэння новай экспазіцыі. Сярод найбольш значных часовых экспазіцый можна вылучыць такія праекты, як «Беларусь XVI–XVIII стагоддзяў у

партрэтах і геральдыцы», «З крыніц адвечнай прыгажосці. Золата і срэбра ў зборы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь», «Водбліскі ваеннай славы. Зброя і вайсковая амуніцыя XIX – першай паловы XX стагоддзя», «Ад рымскага дынарыя да беларускага рубля», «Гандаль Беларусі на шалях гісторыі», «Беларусь: адраджэнне духоўнасці» і інш. [5, с. 16].

На думку расійскай даследчыцы, доктара мастацтвазнаўства, прафесара М. Ц. Майстроўскай сучасная экспазіцыя дэманструе сувязь навукі з разнастайнасцю творчых канцэпцый, розных аўтарскіх поглядаў і пазіцый. Дзякуючы ўключэнню ў творчы працэс мастацка-выразных сродкаў, экспазіцыя атрымлівае новую якасць, становіцца самастойным мастацкім жанрам экспазіцыйнага дызайну. Асаблівае значэнне набывае пабудова экспазіцыйнага вобразу, стварэнне спецыфічнай экспазіцыйнай драматургіі, пошук арыгінальнай мастацка-прасторавай кампазіцыі, аранжыроўка колера-светлавога асяроддзя, мастацка-функцыянальная якасць экспазіцыі, іншымі словамі, асэнсаванне формы экспазіцыі ў якасці аднаго з найважнейшых аспектаў сучаснага музея [7].

Яркім прыкладам такога падыходу ў экспазіцыйнай дзейнасці з'яўляецца Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой». У пачатку XXI ст. у музеі створана новая экспазіцыя «Музей вайны – тэрыторыя міру» агульнай плошчай 990 $м^2$, якая стала тэматычным працягам экспазіцый Музея абароны Брэсцкай крэпасці. Тут прадстаўлены рэліквіі фондавых калекцый мемарыяла, вобразна-скульптурныя інсталяцыі, упершыню выкарыстаны сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі. Да адмысловай катэгорыі музейных рэліквій можна аднесці знаходкі з раскопак, сярод якіх прадметы побыту, зброя абаронцаў крэпасці, аплаўленая полымем агнямётаў цэгла, аскепкі снарадаў. Велізарную каштоўнасць уяўляюць успаміны ўдзельнікаў бітваў, дакументы, фотаздымкі і кінакадры і інш. [8, с. 22]. У студзені 2019 г. была адкрыта гістарычная экспазіцыя «Летапіс Брэсцкай крэпасці», праз два гады наведвальнікам прадстаўлена новая экспазіцыя ў філіяле мемарыяла «Форт № 5 Брэсцкай крэпасці», распрацоўкай канцэпцыі якой займаліся супрацоўнікі музея пад кіраўніцтвам намесніка дырэктара па навуковай рабоце Л. Р. Бібік. Імі была падрыхтавана гісторыка-культурная спецыфіка аб'екта, якая ўключала агляд крыніц і

фондавай калекцыі, кароткую гістарычную даведку аб гісторыі форта, тэхнічнае апісанне і тэхнічны пашпарт аб’екта. Акрамя гэтага, былі складзены абгрунтаванне і структура канцэпцыі экспазіцыі, у якой вылучаліся асобныя падраздзелы з апісаннем мэт, задач, прынцыпаў арганізацыі экспазіцыі, а таксама тэматычная структура з шасці тэм «Гісторыя фартыфікацыі», «Брэсцкая крэпасць як фартыфікацыйны аб’ект», «Форты Брэсцкай крэпасці – сведкі часоў», «Гістарычная рэканструкцыя казематаў гаржовай казармы форта № 5. Пач. XX ст.», «Капанір, патэрна, парахавы склеп як прыклады тыпавых элементаў у доўгачасовых умацаваннях пачатку XX ст.» і «Узоры ўзбраення» і 13 тэматыка-экспазіцыйных комплексаў [6].

Асобай увагі заслугоўвае адноўленая экспазіцыя Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, якая была адкрыта 2 ліпеня 2014 г. і стала своеасаблівым прысвячэннем 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аўтары канцэпцыі ставілі сваёй мэтай стварэнне дынамічнай экспазіцыйнай прасторы з насычанай эмацыянальнай атмасферай. Інфармацыйная сістэма экспазіцыі была аформлена ў адпаведнасці з найноўшымі распрацоўкамі ў галіне мультымедыйных тэхналогій і музейнага дызайну, што з’яўляецца найважнейшай умовай пашырэння камунікатыўных магчымасцей музея. Экспазіцыя была пабудавана тэматычнымі блокамі ў храналагічнай паслядоўнасці. Пры стварэнні канцэпцыі і архітэктурна-прасторавага рашэння экспазіцыі музея аўтарская група ўлічвала спецыфічны архітэктурны ансамбль новага будынка музея, які складаецца з чатырох блокаў, сімвалізуючых чатыры гады вайны. У выніку, створаная экспазіцыя ўяўляецца не проста зборам гістарычных рэліквій, але і прасторай для ажыўлення гістарычных падзей. Музей ператварыўся ў інфармацыйна-экспазіцыйны комплекс, мэта якога – зрабіць успрыманне экспазіцыі наведвальнікамі больш адраснай, інтэграваць культурны і навуковы патэнцыял музея з патрэбамі сучаснага грамадства [3, с. 49–50].

Для Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны на этапе навуковага праектавання экспазіцыі важную ролю адыгралі часовыя экспазіцыі, частка якіх арганізавана як сумесныя праекты з расійскімі музеямі, напрыклад, выставачныя праекты з Цэнтральным музеем Вялікай Айчыннай вайны ў г. Маскве і Ульянаўскім абласным краязнаўчым

музеем імя І. А. Ганчарова, прысвечаныя 65-годдзю Перамогі. Сумесныя часовыя экспазіцыі, падрыхтаваныя разам з архівамі, дазволілі прадставіць выяўленыя і ўведзеныя ў навуковы абарот невядомыя раней дакументы і архіўныя комплексы, выпрацаваць новыя, больш аб'ектыўныя падыходы да асвятлення гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, пераасэнсаваць многія яе гераічныя і трагічныя старонкі [4].

Патрыятычны марафон па гарадах Беларусі з удзелам мабільнага музея «Перамога 75: дарогамі мужнасці і славы» стаў адным з маштабных мерапрыемстваў, прысвечаных юбілею. Перасоўная экспазіцыя была насычана фотадакументамі і знакавымі экспанатамі, дапаўнялася канцэртнымі праграмамі і тэматычнымі інтэрактывамі на тэмы ваеннай гісторыі.

Такім чынам, стварэнне экспазіцый у музеях Беларусі гістарычнага профілю падаецца, з аднаго боку, як складаны навуковы працэс, а з другога – як шматгранная мастацка-творчая дзейнасць, вынікам якой з'яўляецца пагружэнне наведвальніка ў прадметна-прастаравае асяроддзе, развіццё патрыятычных пачуццяў і павагі да мінулага нашай краіны.


1. *Бяспалая, М. А.* Навуковае абгрунтаванне экспазіцыйнага праектавання ў музеях / М. А. Бяспалая // Культура. Наука. Творчество : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств [и др.]. – Минск, 2013. – Вып. 7. – С. 557–561.

2. *Беспалый, Ю. Н.* Художественный дизайн музейной экспозиции как объект интеллектуальной собственности / Ю. Н. Беспалый // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2014. – № 2 (22). – С. 139–144.

3. *Галинская, А. В.* Научная концепция Белорусского государственного музея истории Великой Отечественной войны: история и проектирование экспозиции на современном этапе / А. В. Галинская // История Великой Отечественной войны в современных экспозициях музеев: генезис, проблемы, опыт : сб. материалов межрегиональной науч.-практ. конф, состоявшейся 8 ноября 2013 г. в Центральном музее Великой Отечественной войны. – М., 2015. – С. 47–50.

4. *Галинская, А. В.* Совместные выставочные проекты – творческий потенциал для создания новой экспозиции / А. В. Галинская // Первый Национальный форум «Музеи Беларуси» (Гродно, 12–14 октября 2012 г.) : сб. материалов деловой программы / Ин-т культуры Беларуси. – Минск, 2013. – С. 280–282.

5. Калымага, Н. З гісторыі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь / Н. Калымага // Беларус. гіст. часопіс. – 2019. – № 8. – С. 11–16.

*6.* Канцэпцыя стварэння пастаяннай экспазіцыі музея «Форт № 5 Брэсцкай крэпасці» : зацв. пратаколам пасяджэння навукова-метадычнай рады дзяржаўнай установы «Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» ад 25 кастрычніка 2019 г. № 5 ; рэкаменд. пратаколам пасяджэння Рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях музейнай справы ад 27 лютага 2020 г. – Брэст, 2020.

*7. Майстровская, М.* Музейная экспозиция: тенденции развития / М. Майстровская // На пути к музею XXI века. Музейная экспозиция : теория и практика. Искусство экспозиции. Новые сценарии и концепции : сб. науч. тр. / М-во культуры Рос. Федерации, Рос. академия наук, Рос. ин-т культурологии. – М., 1997. – С. 7–22.

*8.* Музеи Беларуси = Музеі Беларусі = Museums of Belarus / ред. совет: В. В. Андриевич (гл. ред.) [и др.]. – Мінск, 2018. – С. 22.

*9. Никишин, Н.* Музейные средства: знаки и символы / Н. Никишин // На пути к музею XXI века. Музейная экспозиция : теория и практика. Искусство экспозиции. Новые сценарии и концепции : сб. науч. тр. / М-во культуры Рос. Федерации, Рос. академия наук, Рос. ин-т культурологии. – М., 1997. – С. 23–41.

*10.* Рэестр музеяў [Электронны рэсурс] / М-ва культуры Рэсп. Беларусь : афіцыйны сайт. – Рэжым доступу: http://cdn.dkmf.by/RegisterOfMuseums.pdf. – Дата доступу: 13.01.2022.

*11.* Экспазіцыйнае праектаванне [Электронны рэсурс] / Нац. гіст. музей Рэсп. Беларусь : афіцыйный сайт. – Рэжым доступу: http://histmuseum.by/by/research/exhibition-design/. – Дата доступу: 14.01.2022.

УДК [671.1+391.7](315)

***Н. И. Наркевич,***
*кандидат искусствоведения, доцент кафедры теории и истории искусства Белорусского государственного университета культуры и искусств;*

***Чжан Сяолинь,***
*соискатель ученой степени кандидата искусствоведения Белорусского государственного университета культуры и искусств*

# ЮВЕЛИРНОЕ НАСЛЕДИЕ ДРЕВНЕГО КИТАЯ: ИСТОКИ И ХУДОЖЕСТВЕННЫЕ ОСОБЕННОСТИ

**Аннотация**. Декоративно-прикладное искусство Китая – наиболее древний способ художественного освоения предметного мира. Среди шедевров Древнего Китая особой эстетической ценностью обладают произведения ювелирного искусства. Наследие мастеров ювелирного дела представлено богатым ассортиментом изделий, материалов и